# ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні V адкрытага абласнога фестывалю-конкурсу беларускай музыкі «Вянок дружбы»

1. Агульныя палажэнні:

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак і ўмовы правядзення V адкрытага абласнога фестывалю-конкурсу беларускай музыкі «Вянок дружбы» (далей – фестываль-конкурс).

1.2. Фестываль-конкурс беларускай музыкі праводзіцца з мэтай патрыятычнага духоўна-маральнага выхавання вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

1.3. Фестываль-конкурс праводзіцца па ініцыятыве дзяржаўнай установы адукацыі (далей – ДУА) «Сярэдняя школа № 18 імя Л.М. Даватара г. Гродна» пры падтрымцы ДУА «Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі».

2. Мэта і задачы фестывалю-конкурсу:

папулярызацыя беларускай народнай і аўтарскай музыкі;

актывізацыя творчай інструментальна-выканаўчай дзейнасці вучняў фартэпіянных і народных аддзяленняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дзе арганізаваны факультатыўныя заняткі музычнай і харэаграфічнай накіраванасці;

выяўленне таленавітых выканаўцаў, аказанне ім дапамогі і падтрымкі ў самарэалізацыі і сацыялізацыі, фарміраванне банка даных юных талентаў;

абмен творчымі дасягненнямі і наладжванне творчых кантактаў паміж настаўнікамі музыкі горада Гродна, вобласці і рэспублікі.

3. Умовы, парадак і тэрмін правядзення фестывалю-конкурсу:

3.1. Адкрыты фармат фестывалю-конкурсу дазваляе прымаць удзел салістам і ансамблям Гродзенскай вобласці, іншых рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь.

3.2. У фестывалі-конкурсе прымаюць удзел салісты і ансамблі, хоры, аркестры **устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дзе арганізаваны факультатыўныя заняткі музычнай накіраванасці.** Удзельнікі фестывалю-конкурсу жанраў «Інструментальная музыка» і «Вакал» выконваюць адзін аўтарскі твор беларускага кампазітара, апрацоўкі беларускіх народных песень або танцаў, апрацоўкі на беларускія тэмы. Не дазваляецца выкананне твораў пад фанаграму. Замена заяўленых твораў не дапускаецца. Творы выконваюцца на памяць. Удзельнікі фестывалю-конкурсу жанра «Харэаграфія» прадстаўляюць беларускі народна-сцэнічны танец, або беларускі стылізаваны танец.

4. Фестываль-конкурс праводзіцца ў вочнай форме.

4.1. Фестываль-конкурс праводзіцца па наступных жанрах, накірунках і ўзроставых групах:

Жанр «Харэаграфія»

| Намінацыі | Узроставыя групы |
|---|---|
| Калектыў беларускага народна-сцэнічнага танца | група А: 6-8 год;<br>група В: 9-10 год;<br>група С: 11-13 год;<br>група D: 14-17 год;<br>група Е: змешаная ўзроставая катэгорыя. |
| Калектыў беларускага стылізаванага танца | група А: 6-8 год;<br>група В: 9-10 год;<br>група С: 11-13 год;<br>група D: 14-17 год;<br>група Е: змешаная ўзроставая катэгорыя. |

Удзельнікі прадстаўляюць конкурсны нумар у адной з названых намінацый. Агульная працягласць нумара не больш за 4 хвіліны.

Жанр «Вакал»

| Накірункі | Узроставыя групы |
|---|---|
| Сольнае выкананне | група А: 6-8 год;<br>група В: 9-10 год;<br>група С: 11-13 год;<br>група D: 14-17 год. |
| Ансамбль – склад вучняў да 8 чалавек (дазваляецца ўдзел настаўніка толькі ў якасці канцэртмайстра) | група А: 6-8 год;<br>група В: 9-10 год;<br>група С: 11-13 год;<br>група D: 14-17 год;<br>група Е: змешаная ўзроставая катэгорыя. |
| Хор – склад вучняў да 30 чалавек (дазваляецца ўдзел ілюстратараў, не больш за 15 %) | група А: 7-10 год;<br>група С: 11-15 год;<br>група Е: змешаная ўзроставая катэгорыя. |

Удзельнікі прадстаўляюць конкурсны нумар у адной з прапанаваных намінацый. Агульная працягласць нумара не больш за 4 хвіліны.

Варыянты выканання: фанаграма «-1», інструментальнае суправаджэнне, а cappella. Выкарыстанне бэк-вакалу дапушчальна, калі ён не ідзе ва ўнісон і не перакрывае дынамічна асноўную партыю.

Жанр «Інструментальная музыка»
(фартэпіяна, скрыпка, баян, акардэон, гітара, балалайка, домра, цымбалы, духавыя інструменты)

| Накірункі | Узроставыя групы |
|---|---|
| Сольнае выкананне | група А: 1-2 кл.;<br>група В: 3- 4 кл.;<br>група С: 5-6 кл.;<br>група D: 7-8-9 кл. |
| Ансамбль | група А: 1-2 кл.; |

| | |
|---|---|
| (дазваляецца ўдзел настаўніка толькі ў якасці канцэртмайстра) | група B: 3-4 кл.;<br>група C: 5-6 кл.;<br>група D: 7-8-9 кл;<br>група E: змешаная ўзроставая катэгорыя. |
| Аркестр – склад вучняў да 30 чалавек (дазваляецца ўдзел ілюстратараў, не больш за 15 %) | група A: 2-4 кл.;<br>група C: 5-9 кл.;<br>група E: змешаная ўзроставая катэгорыя. |

4.2. Конкурс складаецца з трох этапаў: I этап – адборачны; II этап – завочны, III этап – фінальны (прадугледжвае вочны ўдзел калектыву, саліста, ансамбля).

4.2.1. I этап – адборачны тур (01.02.2023 – 20.02.2023). Афармленне пратаколаў і заяўкі-анкеты. Праводзіцца на базе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі.

4.2.2. II этап – завочны тур (20.02.2023 – 20.03.2023). Праводзіцца сярод выканаўцаў, якія прайшлі адборачны тур. Экспертныя камісіі ацэньваюць удзельнікаў завочнага тура фестывалю-конкурсу. Па выніках працы экспертнай камісіі фестывалю-конкурсу падводзяцца вынікі і фарміруецца спіс удзельнікаў III (фінальнага) этапу.

4.2.3. Да ўдзелу ў II (завочным) этапе фестывалю-конкурсу не пазней за 21.02.2023 (дата атрымання матэрыялаў вызначаецца па даце паштовага штэмпеля) прадстаўніком удзельніка фестывалю-конкурсу або ўдзельнікам фестывалю-конкурсу ў адрас аргкамітэта накіроўваюцца два пакеты дакументаў:

Першы пакет дакументаў:

копія загада аб адкрыцці факультатыўных заняткаў музычна-харэаграфічнай накіраванасці;

выпіска з пратакола накіруючага боку аб допуску да ўдзелу ў II (завочным) этапе фестывалю-конкурсу;

заяўка на ўдзел у II этапе фестывалю-конкурсу ў фармаце MicrosoftWord па форме згодна з Дадаткамі 1, 2 (у двух табліцах усе заяўкі ўдзельнікаў ад установы адукацыі);

спіс складу ансамбля, калектыва па форме згодна з Дадаткам 3;

копія дакумента, які пацвярджае асобу кожнага ўдзельніка фестывалю-конкурсу;

копія квітанцыі аб аплаце з паметкай на квітанцыі «Аплата II этапу».

Дакументы дасылаюцца па пошце на адрас аргкамітэта: 230012, г. Гродна, вул. Пушкіна, 40, ДУА «Сярэдняя школа № 18 імя Л.М. Даватара г. Гродна» (з абавязковай паметкай на канверце «Вянок дружбы»).

Другі пакет дакументаў:

заяўка на ўдзел у II этапе фестывалю-конкурсу ў фармаце MicrosoftWord па форме згодна з Дадаткамі 1, 2 (у двух табліцах усе заяўкі ўдзельнікаў ад установы адукацыі)**;**

спіс складу ансамбля, калектыва па форме згодна з Дадаткам 3;

відэазапіс конкурснай праграмы без прыкметаў мантажу ў адным з фарматаў: MPEG-4, AVI;

Дакументы накіроўваюцца на электронную пошту vyanok_drujby@mail.ru (з абавязковай паметкай у тэме ліста «Вянок дружбы»).

4.2.4. Да ўдзелу ў III (вочным, фінальным) этапе фестывалю-конкурсу на электронную пошту, указаную ўдзельнікамі ў заяўцы, не пазней за 07.03.2023 арганізацыйны камітэт высылае ліст-абвестку аб выніках удзелу ў II этапе конкурсу. Прадстаўніком удзельніка фестывалю-конкурсу або ўдзельнікам фестывалю-конкурсу ў адрас аргкамітэта не пазней за 21.03.2023 накіроўваюцца два пакеты дакументаў:

Першы пакет дакументаў:

выпіска з пратакола накіруючага боку аб допуску да ўдзелу ў III (фінальным) этапе фестывалю-конкурсу;

заяўка на ўдзел у III (фінальным) этапе фестывалю-конкурсу ў фармаце MicrosoftWord па форме згодна з Дадаткамі 1, 2 (у двух табліцах усе заяўкі ўдзельнікаў ад установы адукацыі);

спіс складу ансамбля (для калектываў) па форме згодна з Дадаткам 3;

копія квітанцыі аб аплаце з паметкай на квітанцыі «Аплата III этапу».

Дакументы дасылаюцца па пошце на адрас аргкамітэта: 230012, г. Гродна, вул. Пушкіна, 40, ДУА «Сярэдняя школа № 18 імя Л.М. Даватара г. Гродна» (з абавязковай паметкай на канверце «Вянок дружбы»).

Другі пакет дакументаў:

заяўка на ўдзел у III (фінальным) этапе фестывалю-конкурсу ў фармаце MicrosoftWord па форме згодна з Дадаткамі 1, 2 (у двух табліцах усе заяўкі ўдзельнікаў ад установы адукацыі);

спіс складу ансамбля (для калектываў) па форме згодна з Дадаткам 3;

фанаграма «-1» (для жанра «Вакал» абавязкова!) (выкарыстанне бэк-вакалу дапушчальна, калі ён не ідзе ва ўнісон і не перакрывае дынамічна асноўную партыю);

Дакументы накіроўваюцца на электронную пошту vyanok_drujby@mail.ru (з абавязковай паметкай у тэме ліста «Вянок дружбы».

4.2.5. III (вочны, фінальны) этап фестывалю-конкурсу адбудзецца 29-31 сакавіка 2023 года на базе ДУА «Сярэдняя школа № 18 імя Л.М. Даватара г. Гродна» па адрасе: г. Гродна, вул. Пушкіна, 40.

29.03.2023 – жанр «Вакал».

30.03.2023 – жанр «Інструментальная музыка».

31.03.2023 – жанр «Харэаграфія».

Аб часе правядзення ўдзельнікі будуць інфармаваны пазней.

4.3.6. Ад кожнай установы адукацыі высылаецца адзіны агульны пакет дакументаў. Файл з электронным пакетам дакументаў падпісваецца па форме згодна з Дадаткам 4. Магчыма высылка асобных пакетаў дакументаў.

4.3.7. Падача заяўкі азначае згоду выканаўцаў і накіроўваючага боку на фотаздымку, відэаздымку, аўдыёзапіс конкурсных выступленняў і размяшчэння іх у сродках масавай інфармацыі і ў глабальнай камп'ютарнай сетцы «Інтэрнэт». Матэрыялы, прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў пункту 4 Палажэння аб правядзенні фестывалю-конкурсу, да разгляду не прымаюцца. Матэрыялы, накіраваныя для ўдзелу ў фестывалі-конкурсе, не вяртаюцца.

Увага! Унясенне змен у заяўку магчыма не пазней, чым за 10 дзён да пачатку III этапу. Унясенне аднаго змянення ў заяўку – 20.00 бел. руб. Дадзеныя з заяўкі ўносяцца ў дыпломы ў тым выглядзе, у якім яны пададзены ў заяўцы!

4.3.8. Склад журы фарміруецца з педагагічных работнікаў устаноў адукацыі ў сферы музычнага мастацтва, творчых работнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, з’яўляецца пастаянным для ўсіх этапаў фестывалю-конкурсу.

4.3.9. Парадак выканаўцаў устанаўліваецца па ўзросце – ад малодшага да старэйшага ў алфавітным парадку.

5. Узнагароды пераможцаў:

5.1. Пераможцы вызначаюцца ў кожным накірунку і ўзроставай групе:

Гран-пры;

дыпломы Лаўрэатаў I, II, III ступеняў;

дыпломы I, II, III ступеняў;

астатнія ўдзельнікі III этапу атрымліваюць дыплом фіналіста.

5.2. Журы мае права прысуджаць не ўсе дыпломы Лаўрэатаў фестывалю-конкурсу, дзяліць прызавыя месцы. Прысуджэнне дыпломаў з’яўляецца магчымым пры ўмове: колькасць удзельнікаў па кожнай узроставай групе не менш чым 5 чалавек. Рашэнне журы канчатковае і не падлягае перагляду.

5.3. Крытэрыі ацэнкі выступленняў удзельнікаў фестывалю-конкурсу:

узровень выканальніцкага майстэрства, складанасць рэпертуару і аранжыроўкі ад 0 да 10;

адпаведнасць рэпертуару ўзроставым асаблівасцям выканаўцаў ад 0 да 10;

артыстызм, музычнасць, выразнасць ад 0 да 10;

сцэнічная культура, касцюмы і рэквізіт ад 0 да10;

пастаноўка нумара і яго арыгінальнасць ад 0 да10.

Максімальная колькасць балаў 50.

6. Фінансавыя ўмовы:

6.1. Усе выдаткі на арганізацыю мерапрыемства ажыццяўляюцца за кошт аплаты ўдзельнікаў.

6.2. Кошт і парадак аплаты:

6.2.1. За ўдзел у II этапе фестывалю-конкурсу – 10.00 бел. руб. (за 1 нумар).

6.2.2. За ўдзел у III (фінальным) этапе фестывалю-конкурсу:

жанр «Інструментальная музыка» і «Вакал» (накірунак «Сольнае выкананне») – 16.00 бел. руб. (за 1 нумар);

жанр «Інструментальная музыка» і «Вакал» (накірунак «Ансамбль») 1-12 удзельнікаў – 8.00 бел. руб. з кожнага ўдзельніка (за 1 нумар), больш за 12 удзельнікаў – 6.00 бел. руб. з кожнага ўдзельніка (за 1 нумар);

жанр «Вакал» (накірунак «Хор»), жанр «Інструментальная музыка» (накірунак «Аркестр»), жанр «Харэаграфія» – 6.00 бел. руб. з кожнага ўдзельніка (за 1 нумар).

6.4. Фінансаванне расходаў на праезд, пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў конкурсу ажыццяўляецца за кошт накіроўваючага боку.

6.5. Атрымальнік плацяжу: ДУА «Сярэдняя школа № 18 імя Л.М. Даватара г. Гродна», 230012, г. Гродна, вул. Пушкіна, 40, тэл. (80152) 44 36 85. УНП 590889580, ОКПО 297281884000, ф-л № 400, БИК – AKBBBY2X, ГОУ АСБ «Беларусбанк», р/с BY45 AKBB 3632 5020 0292 6400 0000, адрас банка: 230011, г. Гродна, вул. Новакастрычніцкая, 5.

Пазначаецца прозвішча, імя канкурсанта ці калектыву. Мэта плацяжу: «Вянок дружбы».

6.6. Пасля падачы заяўкі конкурсная праграма ўдзельніка не падлягае змяненню, а стартавы ўзнос не падлягае вяртанню, нават па ўважлівай прычыне.

6.7. З дзяцей-інвалідаў аплата за ўдзел не бярэцца (пры ўмове прадастаўлення ў аргкамітэт адпаведных дакументаў).

7. Па выніках трох этапаў конкурсу прафесійным журы будуць адабраны найлепшыя нумары, якія ўвойдуць у фінальны юбілейны гала-канцэрт (май 2023 года). Гала-канцэрт адбудзецца на базе філіяла «Канцэртная зала» ДУ «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры» па адрасе: г. Гродна, вул. Дзяржынскага, 1.

8. Агульнае кіраўніцтва па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю-конкурсу ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам фестывалю-конкурсу.

8.1. Арганізацыйны камітэт фестывалю-конкурсу:

разглядае і зацвярджае план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю-конкурсу;

разглядае і зацвярджае праграму правядзення фестывалю-конкурсу;

разглядае і зацвярджае склад журы фестывалю-конкурсу;

узнагароджвае фіналістаў, прызёраў фестывалю-конкурсу дыпломамі;

вырашае іншыя арганізацыйныя пытанні.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне: 8(0152) 44 36 89 (Емельянчык Вольга Сяргееўна).